# Выстаўка літаратуры

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна арганізавала вялікую выстаўку літаратуры да 30-годдзя ленінска-сталінскага камсамола. 150 экспанатаў выстаўкі паказваюць ролю ВКП(б)—арганізатара і кіраўніка камсамола, нараджэнне камсамола, яго ролю ў баях за Радзіму і ў пасляваенным уздыме народнай гаспадаркі.

Першы раздзел выстаўкі адкрываецца кнігамі Леніна і Сталіна аб задачах камсамола. Тут-жа брашуры М. І. Калініна «Аб моладзі», «Аб комуністычным выхаванні».

На выстаўцы прадстаўлены шматлікія выданні рамана А. Фадзеева «Маладая гвардыя», брашуры і кнігі, якія расказваюць аб камсамольцах—абаронцах горада Леніна, героях барацьбы супраць нямецкіх акупантаў.

Даведачна-бібліяграфічны аддзел падрыхтаваў і разаслаў масавым бібліятэкам рэспублікі рэкамендацыйны спіс літаратуры да 30-годдзя ВЛКСМ.